## ДА АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДУ

# СТУДЭНТ І ПЕРАБУДОВА

Ва ўмовах ажыццяўлення перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне вялікае значэнне надаецца самастойнай рабоце студэнтаў. Гэта ў першую чаргу датычыць эканамістаў, таму што ва ўсіх галінах інтэнсіўна ўдасканальваецца гаспадарчы механізм. Толькі за апошнія два гады па гэтаму пытанню прынята 17 пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. Зразумела, што веданне іх кожным студэнтам неабходна. Паколькі ж апошні падручнік па курсу «Планаванне эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР» выдадзены ў 1984 годзе, то ў ім не знайшлі адлюстравання асноўныя палажэнні па ўдасканальванню паказчыкаў планавання і ўсяго гаспадарчага механізма. Значыць, для таго, каб будучы спецыяліст быў на ўзроўні вырашаемых у эканоміцы задач, ён абавязаны ведаць не толькі новыя нарматыўныя акты, але і пастаянна вывучаць навуковую і вытворчую літаратуру.

Усведамляючы адказнасць за арганізацыю самастойнай работы студэнтаў па курсу «Планаванне эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР», мы да пачатку бягучага навучальнага года распрацавалі планы семінарскіх заняткаў па ўсіх тэмах з указаннем да кожных заняткаў дадатковай літаратуры. Іх раздалі ў кожную групу, а ў сакавіку, пасля размнажэння, — кожнаму студэнту. Было вырашана з дэканатам і дамоўлена са студэнтамі, што за кожныя прапушчаныя заняткі, незалежна ад прычын, яны абавязаны адпрацоўваць не менш трох гадзін, каб тэзісна законспектаваць у сшытку прапрацаваную дадатковую літаратуру. Такая мера прадугледжана перш за ўсё для тых студэнтаў, якія лічаць не абавязковым наведваць заняткі. Аднак некаторыя студэнты не толькі ігнаруюць нашу дамоўленасць, але і наогул не рыхтуюцца да заняткаў. Самай недысцыплінаванай у гэтых адносінах з'яўляецца група 0-32. Асобныя яе студэнты прапусцілі па 8—12 і нават больш гадзін. Усяго ж у гэтай групе па выкладаемаму мной курсу 66 гадзін пропускаў. Аднак адпрацоўваць іх многія нават і не думаюць. Сярод злосных прагульшчыкаў — М. Новак (12 гадзін), А. Грыбоўскі, А. Байкоў (па 6 гадзін) і інш.

У групе 0-31 «рэкардсменамі» па пропусках заняткаў з'яўляюцца А. Гарбузаў, С. Геронiна, А. Ісаеў, А. Мельнікаў. Аб крайне нездавальняючай падрыхтоўцы да заняткаў сведчаць і такія факты: 9-га сакавіка 15 студэнтаў прыйшлі на іх зусім непадрыхтаванымі, 10 чалавек атрымалі нездавальняючыя адзнакі. 30-га сакавіка 10 студэнтаў не з'явіліся на заняткі, на якіх выконвалася кантрольнае заданне. Гэтыя факты вядомыя дэканату (напісаў дакладную), камітэтам камсамола факультэта і універсітэта, аднак зрухаў да лепшага мала.

Хіба такія адносіны могуць быць цярпімымі? Кожнаму зразумела, што глыбіня ведаў закладваецца толькі пры сістэматычнай самастойнай рабоце. І ні ў якім разе студэнт не здолее авалодаць імі ў перыяд сесіі пры падрыхтоўцы да экзамена.

Перакананы, што абсалютная большасць студэнтаў правільна зразумела скарачэнне аўдыторных заняткаў, сістэматычна займаецца самападрыхтоўкай. Аднак ёсць і такія, хто ўбачыў у гэтым рэзерв вольнага часу. Да гультаёў і прагульшчыкаў не павінна быць ніякай літасці. Да іх трэба прымяняць самыя строгія меры ўздзеяння, перш за ўсё выхаваўчыя (абмеркаванне ў групе, на пасяджэнні ВВК, камітэта камсамола, індывідуальныя гутаркі выкладчыкаў, кіраўнікоў факультэта), каб было павучальна і для іншых.

Варта, на наш погляд, больш дакладна распрацаваць сістэму адказнасці студэнтаў за бягучую паспяховасць і наведванне заняткаў. І каб яна была не толькі на паперы, а дзейсна прымянялася на практыцы.

У новых умовах значна павялічылася нагрузка на выкладчыкаў. Яны абавязаны прыкметна ўзмацніць кантроль за самастойнай работай студэнтаў. Яго можна ажыццяўляць па-рознаму: шляхам напісання і праверкі іх рэфератаў па найбольш важных тэмах, праверкай канспектаў па дамашніх заданнях, у індывідуальных гутарках і г. д. Адначасова гэта патрабуе ўпарадкавання нагрузкі выкладчыкаў з улікам затрат працы на ўказаныя мэты. Словам, у новых умовах работы патрэбны і новыя падыходы.

**Б. ВРУБЛЕЎСКІ,**
**дацэнт кафедры галіновых эканомік.**

# ЭФЕКТЫЎНЫМІ МЕТАДАМІ

Рашэнне пастаўленай XXVII з'ездам КПСС задачы па ўдасканальванню ўсёй сістэмы адукацыі мае на ўвазе, у прыватнасці, укараненне эфектыўных метадаў навучання пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Ва ўмовах пачатай перабудовы дзейнасці вышэйшай школы галоўная стаўка робіцца на пошук такіх форм і метадаў навучання, якія нацэлены на максімальную актывізацыю самастойнай работы студэнтаў.

У. І. Ленін бачыў сутнасць кіраўніцтва студэнтамі ў тым, каб «даць асноўныя паняцці па выкладаемаму прадмету і ўказаць, у якім напрамку трэба вывучаць яго больш падрабязна і чаму важна такое вывучэнне». Гэтыя ленінскія словы знаходзяць паслядоўнае адлюстраванне ў сённяшнім змяненні структуры вучэбнага працэсу ў бок памяншэння колькасці лекцыйных гадзін і павышэння якасці самастойнай работы студэнтаў. Пры гэтым варта адрозніваць два віды самастойнай работы студэнтаў пад кантролем выкладчыка. Першае— самастойная работа на лекцыях і ў працэсе правядзення практычных і лабараторных заняткаў, другое — самастойная праца па-за вучэбнымі заняткамі. Хаця канчатковая мэта ў тым і другім выпадках адна і тая ж, але спецыфіка яе арганізацыі і, перш за ўсё, метадычнае забеспячэнне патрабуе рознага падыходу. У першым выпадку ўзнікае неабходнасць у стварэнні метадычных дапаможнікаў новага тыпу, а іменна такіх, у якіх коратка і дастаткова ясна выкладаліся б асноўныя ідэі і паняцці вывучаемага прадмета. Тыя пытанні, якія вызначаюць асноўныя ідэі і паняцці вывучаемага прадмета, прафесар Л. А. Шамяткоў прапанаваў назваць ядром данай вучэбнай дысцыпліны. Мэтазгоднасць выдзялення такой структуры абумоўлена тым, што задача навучання, напрыклад, матэматыцы ў значнай меры заключаецца не толькі, а дакладней, не столькі ва ўменні даказваць тэарэмы, колькі ў здольнасці авалодаць сістэмай асноўных паняццяў, гэта значыць, засвоіць гэтыя паняцці, разумець іх узаемасувязі і ўмець імі карыстацца пры вывучэнні тэорыі і пры рашэнні практычных задач па данай вучэбнай дысцыпліне.

Акрамя таго, мэтазгоднасць афармлення ядра кожнай вучэбнай дысцыпліны абумоўлена і актуальнай задачай сістэматызацыі інфармацыйных звестак. Наяўнасць такой сістэматызацыі можа садзейнічаць засваенню студэнтамі перш за ўсё тых ідэй і паняццяў, якія будуць затым істотна развівацца і прымяняцца пры вывучэнні наступных матэматычных навук.

На кафедры алгебры і геаметрыі падрыхтаваны да выдання вучэбна-метадычны дапаможнік указанага вышэй тыпу па аналітычнай геаметрыі для студэнтаў першага курса. На нашым факультэце пачата распрацоўка падобных дапаможнікаў і па іншых прадметах.

Спецыфіка арганізацыі самастойнай работы студэнтаў пад кантролем выкладчыка абумоўлена, у асноўным, наступнымі акалічнасцямі. Змяншэнне колькасці лекцый без адпаведнага скарачэння вучэбнай праграмы прыводзіць да таго, што частка пытанняў не атрымлівае належнага асвятлення на лекцыях. Таму вельмі мэтазгодным з'яўляецца выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў, у якіх растлумачваюцца пытанні праграмы, што не разглядаюцца на лекцыях. Першы вопыт работы з такога роду дапаможнікам ёсць на нашай кафедры. Ён падрыхтаваны аўтарам гэтага артыкула.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, асабліва першага курса, пад кантролем выкладчыка з выкарыстаннем адпаведных вучэбна-метадычных дапаможнікаў садзейнічае паспяховай вучобе студэнтаў, выпрацоўвае ў іх свядомыя адносіны да засваення праграмнага матэрыялу і светапоглядавых асноў прафесіянальнага мыслення.

Такім чынам, дабіцца эфектыўнасці ўсіх форм самастойнай работы студэнтаў можна тады, калі будзе вырашана перш за ўсё праблема адпаведнага метадычнага забеспячэння гэтага важнага віда вучэбнай дзейнасці. І тут нельга абысціся без унутрыуніверсітэцкага выдавецтва. Калі яго нельга мець універсітэту, дык з дапамогай партыйных і савецкіх органаў трэба вырашаць пытанне аб адкрыцці выдавецтва для ВНУ нашага горада. На прадстаячым агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на вырашэнне задачы метадычнага забеспячэння самастойнай работы студэнтаў.

У вучэбным раскладзе нашага факультэта на бягучы семестр самастойная работа студэнтаў пастаўлена пад кантроль выкладчыка. Першы вопыт яе арганізацыі засведчыў, што яна не вельмі эфектыўная, калі праводзіцца з вялікай колькасцю студэнтаў. Як максімум, дастаткова адной групы. Але і тут узнікае праблема: не хапае аўдыторый. Зразумела, ва універсітэце існуюць сур'ёзныя цяжкасці з вучэбнымі плошчамі. Але на прыкладзе нашага вучэбнага корпуса бачна, што эфектыўнасць выкарыстання аўдыторнага фонду па-сапраўднаму не вывучаецца. Лічу, што ва універсітэце павінна дзейнічаць камісія па рацыянальнаму размеркаванню і выкарыстанню аўдыторый. Не сказалі тут пакуль што свайго слова камісія па кантролю адміністрацыі за якасцю вучэбна-метадычнай работы пры парткоме, галаўная група народнага кантролю. Думаецца, што і гэта пытанне нельга абысці ўвагай на прадстаячым партыйным сходзе.

**Л. ПАЛЯКОЎ,**
**дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі, сакратар партбюро матэматычнага факультэта.**

# ЗАДАЧЫ ЭКАНАМІСТАЎ

Пярвічная арганізацыя навуковага эканамічнага таварыства універсітэта налічвае ў сваіх радах 625 выкладчыкаў і студэнтаў. Яны праводзяць значную работу па развіццю эканамічнай навукі і ўкараненню яе дасягненняў на прадпрыемствах г. Гомеля і нашай вобласці. Аб гэтым гаварылася на справаздачна-выбарным сходзе, з дакладам на якім выступіла старшыня праўлення НЭТ загадчыца кафедры АМАЭІ дацэнт А. А. Скорава.

У дакладзе, а таксама ў выступленнях удзельнікаў сходу, адзначаліся не толькі станоўчыя моманты ў рабоце пярвічнай арганізацыі, але і была звернута ўвага на пытанні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Указвалася на неабходнасць паглыбленага вывучэння навукова-эканамічных праблем, больш паспяховага ўкаранення гаспадарчага разліку і самафінансавання на прадпрыемствах, шырокага выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў прамысловасці.

На сходзе выбраны новы састаў праўлення НЭТ, рэвізійная камісія, дэлегаты на III абласную справаздачна-выбарную канферэнцыю навуковага эканамічнага таварыства.

**Г. БАЛТРУШЭВІЧ,**
**член праўлення НЭТ ГДУ.**




# ЗА ЧЫСЦІНЮ ПАРТЫЙНЫХ РАДОЎ

Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя перамагла. Але задачы, якія стаялі перад ёй, акрамя звяржэння самадзяржаўя, заставаліся нявырашанымі. Атрымаўшы ўладу ў свае рукі з дапамогай сацыял-згоднікаў, буржуазія не магла і не жадала рашаць гэтых задач, не магла і не жадала даць працоўным масам ні міру, ні зямлі. Наадварот, буржуазны Часовы ўрад спрабаваў выкарыстаць рэвалюцыю для больш актыўнага ўдзелу Расіі ў імперыялістычнай вайне.

Перад бальшавіцкай партыяй паўстала задача: растлумачыць ап'янёным першымі поспехамі рабочым і салдатам, што да поўнай перамогі рэвалюцыі яшчэ далёка, што пакуль ўлада знаходзіцца ў руках буржуазнага Часовага ўрада, а ў Саветах гаспадараць меншавікі і эсэры, — народу не атрымаць ні міру, ні зямлі, ні хлеба, што для поўнай перамогі неабходна зрабіць яшчэ адзін крок наперад і перадаць уладу Саветам.

Галоўны лозунг гэтага перыяду — «Уся ўлада Саветам!» — азначаў, што неабходна скончыць з двоеўладдзем; ён быў разлічаны на выкрыццё сапраўднай прыроды меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў як лакеяў імперыялізму.

Гэта была ўстаноўка на мірнае развіццё рэвалюцыі, таму што для таго, каб Саветы ўзялі ўсю ўладу ў свае рукі, дастаткова было не падтрымліваць Часовы ўрад і заваяваць большасць у Саветах шляхам выкрыцця меншавікоў і эсэраў, якія не хацелі ўлады Саветаў, улады рабочых і сялян.

Аднак выкананне гэтай устаноўкі, асабліва ва ўмовах Беларусі, ускладнялася радам прычын. У Беларусі з яе адносна адсталай прамысловасцю, з вялікай дробнабуржуазнай праслойкай рамесных рабочых у радах пралетарыяту, у значнай меры атручаных нацыяналізмам, дробнабуржуазныя партыі — меншавікі, эсэры, бундаўцы, беларускія нацыяналісты — мелі больш спрыяльную глебу для распаўсюджвання свайго ўплыву, чым у перадавых пралетарскіх цэнтрах Расіі. Гэтым, у асноўным, і былі выкліканы тыя абставіны, што частка бальшавіцкіх груп у Беларусі, як і ў некаторых іншых раёнах Расіі, пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі фармальна аб'ядналіся ў адзіныя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі разам з меншавікамі і бундаўцамі.

Уваход у аб'яднаныя арганізацыі з сацыял-згоднікамі быў буйнейшай памылкай бальшавікоў, на недапушчальнасць якой неаднойчы ўказваў У. І. Ленін. Ужо ў тэлеграме бальшавікам, якія ад'язджалі з эміграцыі ў Расію, У. І. Ленін пісаў: «Наша тактыка: поўны недавер, ніякой падтрымкі новаму ўраду, Керанскага асабліва падазраём, узбраенне пралетарыяту — адзіная гарантыя, тэрміновыя выбары ў Петраградскую думу, ніякога збліжэння з іншымі партыямі. Тэлеграфуйце гэта ў Петраград».

Аб'яднаная група ў Гомелі існавала на працягу сакавіка месяца пад назвай Гомельская аб'яднаная арганізацыя сацыял-дэмакратаў. Ініцыятарамі стварэння гэтай арганізацыі і на чале яе сталі па-меншавіцку настроеныя старшыня Гомельскага Савета П. Н. Сяўрук і старшыня ваеннай секцыі Савета П. А. Багданаў, які потым да 1921 года вярнуўся ў рады РКП(б).

Аднак да канца сакавіка ў Гомель з турмаў і ссылак вярнуліся старыя вопытныя бальшавікі з багатымі баявымі традыцыямі Палескага камітэта РСДРП(б). Яны першымі ў Беларусі парвалі саюз з партыямі згоднікаў, арганізацыйна размежаваліся з імі і ўзнавілі Палескую арганізацыю РСДРП(б).

6 (19) красавіка 1917 года адбыўся першы легальны арганізацыйны сход бальшавікоў Гомеля, на якім прысутнічала 30 дэлегатаў. Яны прадстаўлялі партыйныя арганізацыі галоўным чынам воінскіх часцей і прадпрыемстваў чыгункі. На гэтым сходзе быў выбраны новы састаў Палескага камітэта РСДРП(б). У яго ўвайшлі В. Т. Пяньеўскі, М. М. Хатаевіч, Д. А. Цырлін, І. М. Якубаў і інш.

19 мая (1 чэрвеня) парвалі з меншавікамі мінскія бальшавікі, выбраўшы свой партыйны камітэт на чале з А. Ф. Мясніковым. У чэрвені—ліпені 1917 года былі ўтвораны самастойныя бальшавіцкія арганізацыі ў Віцебску, Койданаве (цяпер Дзяржынск), Слуцку, Лунінцу, Замір'і. Да канца жніўня такія арганізацыі аформіліся ў Мазыры, Лоеве, Ветцы.

Адмежаванне ад згоднікаў прывяло да хуткага росту ўплыву бальшавікоў сярод рабочых, сялянскіх і салдацкіх мас, да росту радоў партыі. Так, калі 19 красавіка Палеская арганізацыя бальшавікоў налічвала ўсяго 30 членаў, то праз тры тыдні іх колькасць павялічылася ў сем разоў, да VI з'езда партыі ў Палескай арганізацыі стаяла на ўліку 427 чалавек, а да пачатку верасня — 820. Гэтак жа хутка раслі і іншыя бальшавіцкія арганізацыі. У Мінску, напрыклад, і прылягаючых да яго раёнаў да VI з'езда партыі колькасць членаў РСДРП(б) даходзіла да чатырох тысяч чалавек.

Бальшавіцкія арганізацыі Беларусі, якія ўмацоўваліся арганізацыйна і ідэйна, змаглі пераадолець дэзарганізатарскую і раскольніцкую дзейнасць згоднікаў і буржуазных нацыяналістаў і з гонарам справіліся з задачамі, пастаўленымі перад імі Красавіцкімі тэзісамі У. І. Леніна і рашэннямі VI з'езда партыі. Яны забяспечылі паварот асноўных мас салдат Заходняга фронту, мясцовага пралетарыяту і бяднейшага сялянства на бок сацыялістычнай рэвалюцыі.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**дацэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.**

## АРМІЯ—ШКОЛА ВЫХАВАННЯ

# СЛУЖАЦЬ РАДЗІМЕ ДАСТОЙНА

Надыходзіць час вясновага прызыву юнакоў у рады Савецкай Арміі. Набліжаюцца тыя дні, калі і студэнты нашага універсітэта пасля заканчэння першага, другога курсаў стануць у рады савецкіх воінаў для выканання пачэснага абавязку перад Радзімай.

Што можна параіць, пажадаць ім у падрыхтоўцы да гэтага важнага этапу ў жыцці? Найпершае — гонару і годнасці, вытрымкі і адвагі, сілы духу і адказнасці ў выкананні пастаўленых перад імі задач. Тым больш, што сёння ёсць на каго браць раўненне. Менавіта нам і хочацца расказаць аб сябрах-студэнтах эканамічнага факультэта, якія зараз служаць у радах Узброеных Сіл СССР, з якімі мы пастаянна падтрымліваем сувязь і знаходзімся ў курсе іх воінскіх спраў.

Заканчваецца другі год армейскай службы Ігара Кавалёва — выдатніка баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Хутка ён вернецца на родную зямлю з ГДР. Зноў прыйдзе ў наш універсітэт, у нашу дружную студэнцкую сям'ю. Шмат складанасцей і перашкод — фізічных і псіхалагічных— вытрымаў Ігар на службе, як і належыць савецкаму воіну. За выдатную службу ён удастоены дзяржаўнай узнагароды ГДР. Нядаўна Ігар прыняты кандыдатам у члены КПСС. Ён паспяхова праводзіць палітычныя заняткі ў роце.

Быў нашым аднакурснікам і застаецца верным таварышам Андрэй Цыбін. У рады Савецкай Арміі яго прызвалі пасля другога курса вясной мінулага года. Камсамолец нясе службу на Поўначы нашай краіны. Мы часта атрымліваем ад яго весткі. Андрэй піша аб армейскіх буднях з уласцівым яму аптымізмам. І не толькі студэнтам, але і куратару гр. Т-32 Ларысе Рыгораўне Багамаз. Як у студэнцкія гады, так і ў час армейскай службы Андрэю вельмі дапамагаюць яго дружалюбства і самаадданасць, прынцыповасць і вытрымка. Не выпадкова, што ў чалавека з такім шчодрым сэрцам шмат сяброў не толькі ў ГДУ, але і ў арміі.

Нам прыемна было чытаць заметку «Па Леніну звяраючы крок» у армейскай газеце ад 21 сакавіка 1987 года. У ёй пісалася пра Андрэя Цыбіна. Змешчаны і яго фотаздымак. Нас радуюць поспехі нашага таварыша на службе. Камандзіры ацэньваюць яго баявыя дзяжурствы толькі на «выдатна». Андрэй мае ўжо некалькі падзяк, удастоены ганаровага знака «Майстар-умелец».

Вось што піша армейская газета пра нашага таварыша: «...А. Цыбін — памочнік кіраўніка групы палітычных ведаў. Да справы Андрэй адносіцца добрасумленна, адказна і што хацелася б выдзеліць асабліва, нефармальна. Вучыцца ён на «выдатна». Аднак не для таго, каб, як кажуць, збавіць абароты. Пашыраючы грамадска-палітычны кругагляд, ён заўсёды імкнецца дайсці да сутнасці, не баіцца ні цяжкасцей пытання, ні перспектывы доўгага пошуку. У гэтым яму дапамагаюць кнігі, і, перш за ўсё, творчая спадчына У. І. Леніна».

Ігар Кавалёў і Андрэй Цыбін з удзячнасцю ўспамінаюць студэнцкія будні, сяброў па вучобе, выкладчыкаў, якія давалі ім веды, замацоўвалі іх маральныя перакананні. Атрыманыя ў ГДУ веды не толькі абагацілі іх, але і спатрэбіліся на службе. У выніку — падзякі камандзіраў.

Немалаважным для паспяховай службы ў арміі, лічаць Ігар і Андрэй, з'яўляецца фізічная, маральна-псіхалагічная падрыхтоўка, такія якасці, як унутраная сіла духу, уменне зразумець адзін аднаго, аказаць узаемадапамогу ў цяжкую мінуту. А самае галоўнае — гэта ўсведамленне адказнасці перад Радзімай, гордасць за званне савецкага воіна — вартавога міру.

...У той дзень, калі Андрэй Цыбін прымаў воінскую прысягу, на гэтай хвалюючай урачыстасці прысутнічала і яго маці Алена Пятроўна. Тады яна дала маладым воінам мацярынскі наказ: «Памятайце, сыны: за вамі — зямля, якая ўзгадавала вас, за вамі — вашы маці, за вамі — Радзіма, Айчына наша! І няхай у вашых юных, мужных сэрцах гучыць музыка Радзімы, якая ў цяжкія мінуты падтрымае і акрыліць вас на вялікую справу — абарону міру, абарону жыцця, абарону чалавецтва!» Гэтыя словы, запісаныя на плёнку, гучаць у святочныя дні ў мармуровай рытуальнай зале адной з ваенных часцей Поўначы. З гэтымі словамі звяртаемся і мы, вашы сябры па вучобе, да вас, нашы заўтрашнія савецкія воіны. Успамінайце гэтыя словы і ва ўрачысты дзень прысягі Радзіме, і пры заступленні на баявыя дзяжурствы. З гонарам трымайце званне савецкага студэнта на вайсковай службе. Поспехаў вам у баявой і палітычнай падрыхтоўцы, у выкананні самага пачэснага абавязку перад Радзімай!

**Ю. ТАРАСЕНКА,**
**намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ ГДУ,**
**Я. БЕЛАШ,**
**студэнт гр. ЭТ-32, кавалер медаля «За баявыя заслугі».**

## КАНФЕРЭНЦЫІ

# АБ ПРАБЛЕМАХ ХІМІІ

**«Прарыў у будучыню» (праблемы развіцця хіміі) — пад такім дэвізам прайшла работа падсекцыі хіміі на XVI навуковай студэнцкай канферэнцыі.**

Сучасная хімія — разгалінаваная навука, якая вядзе шырокі пошук па многіх напрамках. Некаторыя яе галіны аформіліся як самастойныя навукі (аналітычная, неарганічная, фізічная хімія, хімічная фізіка, біяхімія, крышталехімія, хімія высокамалекулярных спалучэнняў і г. д.). Кожная з іх мае асабісты прадмет даследавання, свае праблемы. Аднак у сучаснай хіміі ёсць рад функцыянальных праблем і напрамкаў, па якіх вядзецца агульны пошук. На іх распрацоўку накіраваны намаганні ўсіх хімічных навук незалежна ад спецыялізацыі. Сюды адносяць праблемы ў галіне сінтэзу новых матэрыялаў. Асаблівую важнасць набывае пытанне аб сінтэзу фізіялагічна актыўных рэчываў, якія вывучаюцца і выкарыстоўваюцца ў біяхіміі і медыцыне.

У галіне хімічнай тэхналогіі прадугледжваюцца даследаванні па ўдасканальванню існуючых і распрацоўка новых тэхналогій. Галоўныя крытэрыі, якім павінна адпавядаць хімічная тэхналогія, — прастата, маластадыйнасць, надзейнасць, малая энергаёмкасць, эканамічнасць, бесперапыннасць, замкнёнасць, нізкія патрабаванні да сыравіны і яе падрыхтоўкі. Галоўная роля ў стварэнні новых тэхналогій належыць каталізу. Тут неабходна назваць каталіз на імабілізаваных ферментах. З ім звязваюць шырокія перспектывы ў тэхналогіі атрымання штучнай ежы (сінтэз бялкоў, амінакіслот, глюкозы), у медыцыне, у хімічным аналізе біялагічна актыўных рэчываў, у імуналогіі, у мікраэнергетыцы. Рашэння сваіх праблем чакае хімічная экалогія, хімічная дыягностыка, хімічная энергетыка.

Аб усіх названых праблемах развіцця хіміі паведамілі ў сваіх 16 дакладах (з іх 9 стэндавых) студэнты першага, другога, чацвёртага і пятага курсаў біялагічнага факультэта. Старшакурснікі І. Талкачова, І. Якаўлева, Т. Цітова, Н. Бяляева, А. Гапеева (навуковыя кіраўнікі — дацэнт С. Ф. Алешка, выкладчык Г. А. Савянок) прадставілі паведамленні па эксперыментальнай навукова-даследчай рабоце. Першакурснікі і другакурснікі выступілі з рэфератыўнымі паведамленнямі. Гэта іх першыя крокі ў самастойным пошуку новага ў галіне біяхіміі, малекулярнай хіміі. Вялікую цікавасць прысутных выклікалі даклады студэнтаў С. Пацёмкінай, В. Кавалевіч, В. Саўкінай, С. Абраменка, В. Гарпушкінай і інш.

Хочацца адзначыць сур'ёзныя адносіны студэнтаў да афармлення стэндавых дакладаў (упершыню на канферэнцыі). У абмеркаванні дакладаў актыўны ўдзел прынялі першакурснікі, выкладчыкі кафедры хіміі.

Усім дакладчыкам уручаны сувеніры. Даклады па экалагічнай тэматыцы былі рэкамендаваны да чытання перад школьнікамі і навучэнцамі тэхнічных вучылішчаў.

**В. СВІРЫДЗЕНКА,**
**дацэнт кафедры хіміі.**
**А. ІЛЬЮШЧАНКА,**
**студэнтка 2-га курса біяфака, староста хімічнага гуртка.**



**Студэнцкія гады ляцяць хутка. І асабліва тады, калі не толькі добра вучыўся, але і быў актыўным удзельнікам усіх цікавых, карысных спраў на факультэце. Да такіх студэнтаў адносяцца пяцікурснікі геалагічнага факультэта А. Соіч і В. Дзядкоў (на здымку).**

Фота **А. Ульянкінай.**

# ЗМЯСТОЎНА, АКТУАЛЬНА

На біялагічным факультэце ГДУ прайшла XVI студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. У яе рамках адбылося пасяджэнне секцыі фізіялогіі чалавека і жывёлін, удзел у якім прынялі студэнты, што спецыялізуюцца на гэтай кафедры, выкладчыкі і супрацоўнікі, а таксама запрошаныя студэнты з Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Даклады прысвячаліся ў асноўным навуковай тэме кафедры і вызначаліся змястоўнасцю, актуальнасцю, цікавымі фактамі, грунтоўнымі вывадамі.

Пасяджэнне секцыі праходзіла ў тэлевізійным класе з выкарыстаннем сучасных тэхнічных сродкаў.

Пераможцамі канферэнцыі сталі студэнткі В. Карніевіч, С. Клешчанок.

Цікавы даклад зрабіла студэнтка 4-га курса заатэхнічнага факультэта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі А. Герасімава. Трэба адзначыць таксама добрыя работы пяцікурсніц біяфака В. Кулыба, І. Сідарэнка, Э. Камруковай, Т. Радзьковай.

Усе пераможцы ўзнагароджаны граматамі, іме уручаны падарункі.

У заключэнні канферэнцыі выступілі студэнткі А. Аўдашова, Т. Якушэвіч, В. Кулыба, выкладчыкі кафедры, якія выказалі пажаданні, каб такі від навуковай дзейнасці студэнтаў працягваўся і актывізоўваўся. Бо навуковая канферэнцыя — гэта добрая школа для тых студэнтаў, якія пачынаюць займацца навукова-даследчай работай.

**І. ЛАБУСАВА,**
**староста фізіялагічнага гуртка;**
**Т. КАРНЕЙКА,**
**рэдактар «Фізіялагічнага бюлетэня».**

# ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

8-га красавіка адбыўся сход працоўнага калектыву эканомфака, на якім абмеркаваны задачы прафсаюзнай арганізацыі факультэта па паглыбленню перабудовы, паляпшэнню работы з кадрамі ў святле рашэнняў студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, XVIII з'езда прафсаюзаў СССР і «Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».

Заслуханы і абмеркаваны даклад старшыні прафбюро факультэта М. У. Акуліча.

У спрэчках на сходзе выступілі дацэнт кафедры галіновых эканомік Б. І. Врублеўскі, дэкан прафесар У. Д. Арэшчанка, ст. н. с. кафедры эканомікі працы Э. І. Лізарава, асістэнт кафедры ТСАЭІ В. А. Драбышэўскі, прарэктар па навуковай рабоце прафесар М. В. Навучыцель, дацэнт кафедры АМАЭІ Л. Я. Аксёнава, загадчыца лабараторый факультэта М. У. Ігнатава.

У дакладзе і выступленнях галоўная ўвага была звернута на пытанні і праблемы, неадкладнае вырашэнне якіх дазволіць узняць на якасна новую ступень падрыхтоўку і выхаванне будучых спецыялістаў эканамічнага профілю, больш інтэнсіўна і эфектыўна развіваць навуковыя даследаванні. Падкрэслівалася, што агульны поспех будзе забяспечаны тады, калі кожны член калектыву факультэта пачне перабудову з сябе. Вучоным, выкладчыкам, супрацоўнікам неабходна працаваць творча, з максімальнай аддачай ведаў і вопыту. Да гэтага абавязвае іх прынятая на сходзе пастанова.

**Г. ГОРБІК,**
**член прафбюро факультэта.**

*Маршрутамі студэнцкіх падарожжаў*

# ПРАЗ ЧАТЫРЫ МОРЫ І АКІЯН

**У мінулым месяцы пяць студэнтаў Гомельскага дзяржуніверсітэта — Галіна Янучок, Наталля Кардзіяк, Алена Гаўрылавец і аўтары гэтых нататкаў — за актыўную работу ў студэнцкіх атрадах былі ўзнагароджаны абкомам камсамола турыстычнымі пуцёўкамі для паездкі па чатырох краінах Міжземнамор'я: Марока, Іспаніі, Мальце, Грэцыі. Аб такім падарожжы можна было толькі марыць.**

## ПА ПАМЯТНЫХ МЯСЦІНАХ РАДЗІМЫ

Зборы былі нядоўгімі. Шостага сакавіка гомельская група ў саставе 12 чалавек адправілася ў Мінск. Акрамя нас у яе ўваходзілі тры студэнты з Гомельскага політэхнічнага інстытута, два — з ГКІ, па аднаму з БІІЧТа і Мазырскага педінстытута. Наша знаёмства адбылося некалькі раней, у абкоме камсамола. А ў кожнага было такое пачуццё, быццам мы ведаем адзін аднаго ўжо даўно.

У беларускую сталіцу прыбылі раніцай. Тут адбылася сустрэча са студэнтамі Мінска і Мінскай вобласці, якія таксама заслужылі права паехаць у цікавае падарожжа.

У бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік» з намі правялі вучобу. Асноўная яе мэта — даць нам, савецкім студэнтам, інфармацыю аб тых краінах, куды ляжаў наш шлях. Затым мы зрабілі агляднаю экскурсію па Мінску, наведалі дом-музей класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Вечарам наша група ў поўным саставе адправілася ў Маскву. Туды прыбылі 8 сакавіка. Міжнароднае свята жанчын найлепшым чынам спрыяла нашаму прыўзнятаму настрою. У Маскве нас размясцілі ў турыстычным комплексе «Маладзёжны». Тут нам прадстаяла пражыць тры дні.

У Маскве для нас была складзена шырокая экскурсійная праграма. У першы дзень у Крамлёўскім Палацы з'ездаў мы глядзелі балет «Стварэнне свету». Назаўтра з ранку адправіліся на экскурсію па Маскве. Азнаёміліся са старой часткай горада і яго новымі мікрараёнамі. З агляднай пляцоўкі на Ленінскіх гарах каля Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава нам адкрылася цудоўная панарама на Маскву-раку, Крэмль, стадыён «Дынама». Затым мы наведалі старажытныя саборы Маскоўскага Крамля, сфатаграфаваліся каля славутых цар-гарматы і цар-звона, на тэрыторыі Крамля пабывалі на тым месцы, дзе ў 20-я гады любіў пасядзець У. І. Ленін, аддаючыся глыбокім роздумам.

Шмат уражанняў засталося ў нас ад знаёмства з Навадзявочым манастыром. Аднак самым памятным стаў дзень 10 сакавіка. Усіх удзельнікаў круіза на аўтобусах павезлі на Красную плошчу. Якое велізарнае шчасце было сваімі вачыма ўбачыць у Маўзалеі правадыра Камуністычнай партыі і стваральніка першай у свеце Савецкай дзяржавы!

Нарэшце, у прасторнай канферэнц-зале гасцініцы адбылося знаёмства з дырэкцыяй круіза, і мы даведаліся аб праграме нашага падарожжа.

Знаходжанне ў Маскве завяршылася. Мы многае ўбачылі, шмат аб чым даведаліся. А наперадзе былі новыя ўражанні, знаёмствы.

11-ГА сакавіка ў 7 гадзін 50 мінут 309 удзельнікаў круіза на аэробусе «ІЛ-86» вылецелі за межы Радзімы. Праз 2 гадзіны 30 мінут наш самалёт прызямліўся ў аэрапорце Будапешта. Многія рабяты жартавалі: «Хто б мог падумаць, што акрамя чатырох краін, мы пабудзем і на вянгерскай зямлі». У аэрапорце была праведзена дазапраўка самалёта, і ён ўзяў курс на Касабланку. За тры з палавінай гадзіны палёту многія не адрываліся ад ілюмінатараў. Пад намі праносілася зямля Італіі, неаглядныя блакітныя прасторы Міжземнага мора... Нарэшце, мы аказаліся над тэрыторыяй Марока. У 12 гадзін па мясцоваму часу наш самалёт прызямліўся ў аэрапорце г. Касабланкі.

## З ЗІМЫ — У ЛЕТА

Касабланка — буйнейшы горад Марока. Самая першая нечаканасць — 25°цяпла. Як кажуць, з зімы — у лета. Вакол — багацце зеляніны і кветак. У аэрапорце правялі таможны агляд, пасля чаго на аўтобусах нас адвезлі на цеплаход «Латвія». Па дарозе літаральна ўсе не маглі адарвацца ад вокнаў аўтобуса, настолькі ўсё было незвычайным, новым: і дамы, і вуліцы, і прырода.

Да абеду мы прыбылі ў порт Касабланкі. Цеплаход «Латвія» на першы погляд здаўся нам зусім невялікім. Але вельмі хутка нашы ўяўленні змяніліся. На ім утульна размясцілася 309 турыстаў і 127 чалавек каманды. Акрамя кают, у ім два рэстараны, дзе на працягу двух тыдняў нас вельмі смачна кармілі, музычны салон з усім неабходным для правядзення святочных вечароў, тры бары, цырульня. На палубе — басейн і тэнісны стол.

Удзельнікамі круіза, акрамя беларускіх студэнтаў, былі юнакі і дзяўчаты з Украіны, Казахстана, Узбекістана, Таджыкістана, Башкірыі, Краснадарскага краю, Валгаградскай, Арэнбургскай і Пермскай абласцей. На працягу 14 дзён кожная дэлегацыя адзначала дзень сваёй рэспублікі або вобласці. У праграму ўваходзілі канцэрты мастацкай самадзейнасці, іншыя цікавыя мерапрыемствы.

Дванаццатага сакавіка мы з цікавасцю знаёміліся з Касабланкай. У перакладзе з арабскай мовы Касабланка — белы горад. І сапраўды, складвалася ўражанне, што ўвесь горад зроблены з белай гліны. Дамы — самыя разнастайныя: ад адна-двухпавярховых катэджаў да шматпавярховых будынкаў.

У Марока — абсалютная манархія. Краінай кіруе кароль Хасан II. У кожным горадзе ў караля ёсць свая рэзідэнцыя. І яшчэ адна навіна: па дахах катэджаў можна здагадацца, да якога саслоўя адносіцца яго гаспадар. Так, напрыклад, дамы пакрытыя зялёнай чарапіцай, сведчаць аб тым, што ў іх жывуць прыбліжаныя караля. Да таго ж гэтыя дамы сваім знешнім выглядам намнога адрозніваюцца ад іншых, у якіх жывуць бедннякі. На многіх тэлеграфных слупах і сценах дамоў вісяць партрэты караля.

У Палацы спорту, гордасці Касабланкі, які мы наведалі, убачылі вялікі партрэт караля і партрэты яго двух сыноў-наследнікаў.

У час экскурсіі частка маршрута праходзіла па скараснай дарозе. Аўтатранспарт ідзе па ёй з хуткасцю, якая дасягае 180—200 км у гадзіну. Паабапал дарогі — высокія бардзюры, што, аднак, не перашкаджае недысцыплінаваным пешаходам пераходзіць яе, ад чаго часам здараюцца аварыі.

Вельмі цікава было азнаёміцца з пляжамі Атлантычнага акіяна — лепшымі ў свеце. На жаль, быў моцны вецер, штарміла, і мы не змаглі пакупацца. Аднак прагулка ўздоўж узбярэжжа, неаглядная сінь акіяна сталі для нас не менш прыемнымі, чым купанне.

Пасля абеду ў нас быў вольны час. Мы хадзілі па гораду, наведалі магазіны. Больш за ўсё запамяталася наведанне Медзіны — гандлёвага цэнтра Касабланкі і базара. Цікавымі былі людзі, асабліва прадавец пітной вады — стары з чалмой на галаве, у цёплым халаце, абвешаны пластмасавымі бутэлькамі з вадой і бубенчыкамі, звон якіх заклікаў прагнаць смагу. Амаль усе гандляры забаранялі сябе фатаграфаваць. У іх гэта не прынята, асабліва ў сельскіх жыхароў. Людзі тут зусім розныя. Вельмі многа гандляроў-дзяцей.

Пасля знаёмства з Касабланкай засталіся розныя ўражанні. Па сутнасці, мы сваімі вачыма ўбачылі іншы свет, пра які ведалі з кніг і тэлеперадач.

**А. БАЛОГА,**
**А. МЕЛЕЖ,**
**студэнты 3-га курса эканамічнага факультэта.**

**(Працяг будзе).**

# СПОРТ

## ВА ЎПАРТАЙ БАРАЦЬБЕ

Завяршыліся гульні па валейболу, якія ўваходзілі ў праграму XVIII універсіяды. Пачатку спаборніцтваў папярэднічала іх урачыстае адкрыццё. Парадам удзельнікаў камандаваў студэнт факультэта фізвыхавання Сяргей Шчука. Ён далажыў в. а. старшыні спартклуба Г. І. Варатніцкаму аб гатоўнасці да спаборніцтваў, які ў сваю чаргу пажадаў спартсменам вялікіх поспехаў.

Спаборніцтвы прайшлі арганізавана і ва ўпартай барацьбе. Сярод мужчынскіх каманд першынство заваявалі студэнты факультэта фізвыхавання. Другое і трэцяе месцы дасталіся адпаведна камандам фізічнага і геалагічнага факультэтаў. Сярод жаночых каманд мацнейшымі сталі валейбалісткі эканамічнага факультэта. У тройцы прызёраў таксама каманды фізічнага факультэта і факультэта фізвыхавання.

Галоўная судзейская калегія вызначыла мацнейшых ігракоў першынства. Імі прызнаны студэнтка эканамічнага факультэта Ірына Субоціна і Ігар Разанцаў з факультэта фізвыхавання.

Каманды-прызёры і лепшыя ігракі першынства ўзнагароджаны граматамі спартклуба ГДУ.

**В. МАКАРЭВІЧ,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў, суддзя рэспубліканскай катэгорыі.**

## ФІНІШАВАЛА СПАРТАКІЯДА «ЗДАРОЎЕ-87»

Завяршыліся спаборніцтвы па праграме спартакіяды «Здароўе-87». У ёй прыняло ўдзел 358 выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

У бягучым навучальным годзе спартыўная барацьба па ўсіх відах насіла настолькі ўпарты характар, што кожнае ачко вырашала лёс каманднага месца. Варта адзначыць поспех геалагічнага факультэта. Упершыню яго каманды здолелі заваяваць першынство. Прызёрамі сталі таксама калектывы фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Расстаноўка сіл у цэлым бачна на табліцы. У залік ішлі лепшыя вынікі па пяці відах праграмы.

На спартакіядзе ўпершыню выступалі каманды агульнауніверсітэцкіх кафедр. На жаль, яны спаборнічалі толькі ў трох відах праграмы, хаця магчымасці іх значна большыя.

Пакуль што слаба яшчэ далучаюцца да спартыўных спаборніцтваў работнікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Не робіць гонару факультэту фізічнага выхавання занятае ім на спартакіядзе сёмае месца.

| Факультэты | шахматы | валейбол | наст. тэніс | стральба | плаванне | лыжны спорт | міні-футбол | рыбнал лоўля | ачкі | месца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Матэматычны | 3 | 4 | 3 | 4 | 1 | 6 | 1 | 3 | 11 | III |
| Фізічны | 1 | 3 | 5 | 1 | 3 | 2 | 3 | — | 10 | II |
| Геалагічны | 2 | 2 | 1 | 3 | 2 | 3 | 3 | 2 | 9 | I |
| Эканамічны | — | 1 | 2 | 2 | 4 | 4 | — | — | 13 | IV |
| Гістфіл | 5 | 6 | — | 7 | — | 1 | 5 | — | 24 | VI |
| Біялагічны | 4 | 5 | 6 | 6 | 5 | — | 2 | 4 | 21 | V |
| Фізвыхавання | — | 7 | 4 | 9 | — | 5 | — | 1 | 26 | VII |
| АГЧ | — | — | — | 8 | — | — | — | — | — | — |
| Грамадскія кафедры | — | — | 6 | 5 | — | 7 | — | — | — | — |

**А. ГРЫШАЧКІН,**
**галоўны суддзя спартакіяды «Здароўе-87».**

## ТРЫ ЧЭМПІЁНЫ

У раённым цэнтры г. Ляхавічы, што на Брэстчыне, адбыліся спаборніцтвы на першынство БССР па дзю-до сярод ДЮСШ. Перамогу аспрэчвалі 50 каманд. Паспяхова выступілі юныя асілкі ДЮСШ па барацьбе пры спартклубе нашага універсітэта. У агульным заліку яны заваявалі шостае месца.

Найбольш паспяхова ў сваіх вагавых катэгорыях выступілі Анатоль Старадубцаў, Алег Раманькоў, Міхаіл Чыгуноў (трэнер В. А. Внучкін). Усе яны ўзняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. Сярэбраным прызёрам стаў выхаванец названага трэнера Канстанцін Арапаў.

Заліковыя ачкі свайму калектыву прынеслі таксама Валерый Петачэнка, Дзяніс Кірылёнак, Сяргей Шалоха, Аляксандр Кюнаў.

Мацнейшыя дзюдаісты нашай школы ўключаны ў састаў зборнай каманды рэспублікі.

**Д. ЖАРКОЎ,**
**дырэктар ДЮСШ па барацьбе.**

*Юрыдычная даведка*

# ПРАВЫ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ І ІХ СЕМ'ЯЎ

За асобамі, якія працавалі да прызыву на сапраўдную ваенную службу на прадпрыемствах, ва ўстановах або арганізацыях, захоўваецца права вяртання на ранейшае месца работы. За тымі, хто прызываецца на службу ў рады Савецкай Арміі ў перыяд вучобы ў навучальных установах, пасля заканчэння дадзенага ім у сувязі з гэтым акадэмічнага водпуску, захоўваецца права працягваць вучобу ў той жа навучальнай установе і на тым жа курсе, дзе яны займаліся да прызыву. Стыпендыя (на стацыянары) назначаецца з дня аднаўлення ў навучальнай установе да вынікаў чарговай экзаменацыйнай сесіі.

Звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць права на льготы, карыстаюцца перавагай пры залічэнні на падрыхтоўчыя аддзяленні ВНУ пасля праходжання субяседавання.

За ваеннаслужачымі тэрміновай ваеннай службы захоўваецца жылая плошча, якую яны займалі да прызыву, і яны не могуць быць выключаны са спісаў чарговасці на атрыманне жылой плошчы.

Сем'і ваеннаслужачых, якія загінулі або прапалі без вестак пры абароне СССР ці пры выкананні іншых абавязкаў ваеннай службы, не могуць быць выселены з займаемых імі жылых памяшканняў без прадстаўлення жылой плошчы.

Выканкомы Саветаў народных дэпутатаў не пазней месячнага тэрміну з моманту звароту абавязаны працаўладкаваць жанчын, мужы якіх прызваны на сапраўдную ваенную службу. У гэты ж тэрмін выканкомы мясцовых Саветаў народных дэпутатаў абавязаны ўладкаваць іх дзяцей у дзіцячыя дашкольныя ўстановы, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці.

На дзяцей салдат, матросаў, сяржантаў, старшын тэрміновай службы выплачваецца дапамога ў памеры 35 рублёў у месяц на кожнага. Заява аб назначэнні дапамогі падаецца ваеннаму камісару самім ваеннаслужачым, маці дзяцей ці апекуном.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А324351

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 300.